ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ВЯЛІЧКАВІЦКАЯ СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА САЛІГОРСКАГА РАЁНА»

# Веру не спаліш

Сачыненне-разважанне

Аўтар Рудзеня
Елізавета Валер'еўна,
вучаніца 9 класа
Кіраўнік Аляхновіч
Галіна Уладзіміраўна

Веру не спаліш

Прыгожы восеньскі дзень. Свеціць сонейка. Зрэдку праплыве невялікая хмарка і прасее на зямлю серабрыстыя кроплі-дажджынкі.

У нашай вёсцы свята. Над царквой узняліся купалы! Усе, хто мог, прыйшлі да царквы. На перапынку школа пусцее. Бяжыць хлопчык-другакласнік па калідоры (ён чарговы раз збегаў да царквы) і ўсклікае: «Паглядзіце! Пасля дожджыку над царквою быццам тры сонейкі ўзлятаюць у неба!» Тры сонейкі – гэта тры залацістыя купалы. Свеціцца душа хлопчыка. Сапраўды, радасць вялікая. На вялічкавіцкай зямлі ніколі не было праваслаўнага храма. Але яму наканавана было з'явіцца.  Паспрабую патлумачыць, чаму я  так думаю, адкуль такая ўпэўненасць. Але аб усім па парадку.

Ёсць на Салігоршчыне вёска Вялічкавічы. Афіцыйна – гэта аграгарадок. Але для нас – родная вёска з прыгожай мілагучнай назвай. Калі вы завітаеце да нас на свята Перамогі, то пачуеце, як спяваюць у Доме культуры песню на словы  настаўніцы нашай школы Тычыны Тамары Сцяпанаўны:

Між бяскрайніх даляў палявых,
Між лясоў вялікага Палесся,
Вырваўшыся з колаў агнявых,
Вёска дарагая ўваскрэсла.
Вялічкавічы, вялікія вы
Адвечнай сваёй дабрынёй...

Гэта здарылася 15 лютага 1943 года. Марозная раніца. У вёсцы над комінамі хат узвіваецца дымок. Гаспадыні ўжо запалілі печы, каб сагрэць хату, прыгатаваць снеданне, дагледзець жывёлу і, канешне, памаліцца: «Слава табе, Божа, што дачакаліся свята». Прасілі, каб хутчэй закончылася вайна. Дзень абяцаў быць па-зімоваму прыгожым.

Бяда прыйшла менавіта ў гэты дзень. У вёску ўварваліся фашысты, загадалі ўсім сабрацца каля калгаснага свірна. Людзі думалі, што склікаюць на нейкі сход, бо ў дрэннае не хацелася верыць. Але чаму загадалі браць дзяцей, нават грудных? Няўжо зганяюць  на страшную, пакутлівую смерць?

У гісторыка-дакументальнай кнізе «Памяць. Салігорскі раён» чытаю ўспаміны майго прадзеда Паўла Дзям'янавіча Тарасевіча: «Мне тады было 13. Зіма выдалася лютая. Раніцай прыехалі карнікі і пачалі выганяць людзей з хат. Да нас зайшоў адзін і загадаў бацьку напаіць іх коней. Бацька выйшаў, і я за ім. Убачыў, як гналі па вуліцы сям'ю маёй цёткі, а яна несла ў

руках запаленую свечку. Мне стала страшна. Я пабег на суседні двор. Там сустрэў Ганну. Мы пабеглі ў Ганніну хату і схаваліся ў падпечак...»

Дзеці (мой прадзядуля і яго суседка Ганна), яшчэ некаторыя аднавяскоўцы цудам выратаваліся. А цуд гэты невыпадковы: камусьці трэба было расказаць праўду аб вайне, аб тым, што чалавеку, Божаму стварэнню, нельга ператварацца ў звера.

Успаміны сведкаў вайны чытала многа разоў. На гэты раз так ярка паўстала і запала ў сэрца карціна, як жанчына, ідучы з аднавяскоўцамі і са сваімі дзеткамі на смерць, нясе свечку. Як і кожная маці, яна ў першую чаргу думае пра дзяцей. Хтосьці б крычаў ад страху і роспачы, ад безвыходнасці. А яна ідзе, як мне ўяўляецца, ціха, спакойна, бо ад мітусні свечка пагасла б. Што гэта за сіла, што дапамагае жанчыне так трымацца? Яна верыць у жыццё вечнае! Ідзе як павадыр на апошнім зямным шляху пры пераходзе ў вечнасць. Яна бачыла святло Божай любві. Думаю, толькі гэта магло даць ёй супакаенне. Святла Божай любві не адыме ніхто, толькі сам чалавек можа згубіць яго, калі саступіць з дарогі, што вядзе да Бога. Як саступілі з яе тыя, хто спаліў жывымі 353 жыхары вёсак Новыя Вялічкавічы і Старыя Вялічкавічы.

Прывяду яшчэ адзін прыклад, які сведчыць, што вера ў Бога жыла на маёй зямлі заўжды, нават у самую страшную вайну не была знішчана. У дакументальнай кнізе нашага земляка А.Ф.Ясько «Больно даже мёртвым» ёсць такі факт: «Самыми изощрённым пыткам и издевательствам подвергались малочисленные еврейские общины уже в первые дни войны... В Величковичах после жестоких пыток и избиений были уничтожены Медник Элька, Медник Рася и Капчиц Зусь. Их истерзанные тела палачи выбросили на пыльную деревенскую улицу у плетня, строго-настрого запретив сельчанам приближаться к ним – мол, это пища бродячим псам. Рискуя жизнью, соседка этой еврейской семьи ночью выкрала их. Достала лодку, переправила на противоположный берег реки Морочанки и захоронила».

Вось яны, лепшыя чалавечыя якасці: дабрыня, спагада, ахвяраванне сабой дзеля бліжняга. Аб чым думала гэта жанчына пад покрывам ночы, харонячы загінулых аднавяскоўцаў? І як здолела гэта зрабіць? Тут жа патрэбна была не жаночая сіла, неймаверная вытрымка. А думка, несумненна, была адна: зрабіць па-хрысціянску. Целы павінны быць аддадзены зямлі. Не раз, мабыць, у гэту ноч жанчына прызвала Бога ў дапамогу. Бо тое, што немагчыма чалавеку, магчыма Богу.

Не перарывалася ў Вялічкавічах нітачка памяці аб продках, моцнай была прывязанасць да роднай зямлі. І вось яскравы прыклад.

У спіс аднаўленых пасля вайны вёсак занесены Новыя Вялічкавічы і Старыя Вялічкавічы. Новыя Вялічкавічы жывуць. Старыя Вялічкавічы існавалі да тых пор, пакуль жыў Мікалай Мікалаевіч Яромін.Хата яго бацькоў была на водшыбе вёскі, не ахапіла яе варожае полымя, засталася няспаленай. У вайну Мікалай Мікалаевіч быў яшчэ малым хлапчуком, але памятае жахі вайны. Ён вырас у бацькоўскай хаце , стаў гаспадаром і жыў з жонкай і дзецьмі там . Вёў натуральную гаспадарку, лавіў рыбу, займаўся пчалярствам. Мёд ад Яроміна ведалі і смакавалі па ўсёй акрузе, бо гэты мёд, як казалі, быў асаблівы: сакрэт ведаў дзед Мікалай.А ўвесь сакрэт быў у тым, што гаспадар высяваў каля пасекі нейкую траўку з кветкамі, там збіралі пчолы мёд. Вырабляў дзядуля кашы розныя, на любы густ, а таксама граблі, вуллі – усё, што патрэбна вясковым людзям у гаспадарцы. Было ў Старых Вялічкавічах пасля вайны яшчэ некалькі хат, аднаўленых. Але з часам гаспадары тых хат перабраліся ў Новыя Вялічкавічы ці іншыя населеныя пункты, бо вясенняе разводдзе, адсутнасць дарог ускладнялі  жыццё. А Мікалай Мікалаевіч трывала трымаўся на бацькоўскай зямлі. Вёска з адной хатай існавала аж да 1980-га года. Існавала б і далей, але дзецям прыйшла пара ісці ў сярэднюю школу, а яна адкрылася ў Новых Вялічкавічах, дзе пачалося будаўніцтва калгаса «Прагрэс» і пасёлка са шматпавярховікамі. Пераехалі Яроміны ў кватэру, але хату не разабралі, не прадалі. Увесь вольны час Мікалай Мікалаевіч быў на хутары – так сталі называць месца, дзе была вёска. Не мог не пабачыць, як расцвітае лотаць на старарэччы. Пасля меліярацыі для ракі Морач прызначылі новае рэчышча, і аб гэтым шкадаваў дзед Мікалай. Падкармліваў яблынькі, прышчэпваў дзічкі. Школьнікі, ідучы ў паход па родных мясцінах, заўжды заходзілі да дзядулі. Ён шчодра частаваў садавіной і не прамінаў магчымасці расказаць пра мінулае, пра ўклад сялянскага жыцця і, абавязкова пра вялікі смутак Вялічкавіч – трагедыю 1943 года. Расказваў усё, што захавала яго дзіцячая памяць, што чуў ад старажылаў вёскі. На жаль, дзядулева хата згарэла. Ці хтосьці неасцярожна кінуў запалку, ці іншая прычына – невядома. Гэта была вялікая страта для дзеда Мікалая. Усе чулі ад яго словы, што ля роднай хаты ён жыве па-сапраўднаму. Да канца свайго жыцця дзядуля наведваў сядзібу. Калі ўжо не мог хадзіць, прасіў, каб адвезлі яго паглядзець, як яблынькі зацвілі. Прасіў усталяваць новую шпакоўню: няхай птушачкі спяваюць у дарагім для яго месцы.

Ці ж не ад Бога гэта памкненне зберагчы родны куток, упрыгожыць яго? Адна хата, адна сям'я, адзін гаспадар амаль чатыры дзесяцігоддзі жылі за ўсю вёску. І поле засявалася,

і жыта каласілася, і хлебны водар разносіўся па наваколлі. Усё было, як і раней, да лютага сорак трэцяга.

Вера жыве і ў новых пакаленнях вялічкаўцаў. Нельга без хвалявання чытаць кнігу «Нашчадкі вогненных вёсак» журналіста Таццяны Падаляк. Ёсць у гэтай дакументальнай кнізе раздзел, складзены з матэрыялаў нашых вучняў і настаўнікаў. Вучні сабралі ўспаміны сведкаў вайны, выказалі свой погляд на падзеі Вялікай Айчыннай вайны.

Пагартаем дзіцячы праваслаўны часопіс «Колыбель». І там мы неаднаразова сустрэнем слова «Вялічкавічы» ці «Вялічкавіцкая СШ». Гэта творы нашых вучняў. У свой любімы часопіс вучні даслалі верш пра сваю вёску і яе мінулае. І вось аб чым яны мараць:

...Чтоб люди всей земли большой
Смогли объединиться,
Чтобы фашизму никогда
Не дали возродиться!

Вялікая радасць у Вялічкавічах! На нашай шматпакутнай зямлі стаіць праваслаўны храм. Многія кажуць: "Як ён упрыгожыў нашу вёску!" А мне хочацца сказаць: "Як ён узвялічыў вёску і як ён узвялічыў усіх нас!" У храме Святой праведнай Сафіі, княгіні Слуцкай, сярод мноства агеньчыкаў ёсць агеньчык ад свечкі той жанчыны, што ішла на смерць з верай у жыццё вечнае. І можа, той агеньчык і малітва не далі памяці і праўдзе аб вайне патануць у цемры і ўзмацнілі веру нашчадкаў. Веру не спаліш!